УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”

# ЗБОР ДАКУМЕНТАЎ БЕЛАРУСКІХ ЛІТАРАТАРАЎ, ПЕРАДАДЗЕНЫ З ЦЭНТРАЛЬНАГА АРХІВА КДБ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**1998**

**ФОНД № 418**

**ВОПІС № 1**

**1925–1998 гг.**

МІНСК 2023

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1** **ф. 418**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1 | ДАКУМЕНТЫ У.М. ДУБОЎКІ | 1-9 | 1-2 |
| 2 | ДАКУМЕНТЫ М. БАГУНА, С. ДАРОЖНАГА, Б.М. МІКУЛІЧА, А.В. ПАЛЬЧЭЎСКАГА, С. РАКІТЫ, У.М. ХАДЫКІ, А.І. ЯКШЭВІЧА | 10-19 | 2-4 |

## Прадмова

Дакументы рэпрэсаваных дзеячаў беларускай літаратуры паступілі ў БДАМЛМ у 1998 г. 21 чэрвеня 1993 г. дырэктар БДАМЛМ Г.І. Сурмач, віцэ-прэзідэнт АН Беларусі Р.Г. Гарэцкі, старшыні праўленняў Саюза пісьменнікаў і Саюза кампазітараў Беларусі В.В. Зуёнак і І.М. Лучанок афіцыйна звярнуліся да старшыні КДБ РБ Э.І. Шыркоўскага з просьбай аказаць падтрымку ў пошуку ў архівах ведамства дакументаў (асабліва аўтографаў) рэпрэсаваных пісьменнікаў, паэтаў, мастакоў і кампазітараў Беларусі для іх перадачы на захаванне ў БДАМЛМ[1]. 28 кастрычніка 1998 г. супрацоўнікі КДБ І.А. Валахановіч і Ф.С. Котаў перадалі ў БДАМЛМ па акце дакументы пісьменнікаў М. Багуна, С. Дарожнага, У.М. Дубоўкі, Б.М. Мікуліча, А.В. Пальчэўскага, С. Ракіты, У.М. Хадыкі, перакладчыка і цэнзара А.І. Якшэвіча (Якшэвічуса). Акт перадачы падпісаны намеснікам начальніка Улікова-архіўнага аддзела КДБ падпалкоўнікам М.М. Клімовічам і дырактарам БДАМЛМ Г.В. Запартыкай.

У выніку навуковага апісання перададзенага фонду быў складзены вопіс № 1, у які ўвайшло 19 спраў (60 дакументаў) за 1925–1998 гг. Больш за палову перададзеных дакументаў (34 з 60) тычацца паэта У.М. Дубоўкі, 25 дакументаў, як правіла, невялікага аб’ёму – астатніх персаналій. З увагі на гэта ў вопісе выдзелены 2 раздзелы: “Дакументы У.М. Дубоўкі” і “Дакументы М. Багуна, С. Дарожнага, Б.М. Мікуліча, А.В. Пальчэўскага, С. Ракіты, У.М. Хадыкі, А.І. Якшэвіча”.

У першым раздзеле сабраны дакументы і матэрыялы Дубоўкі Уладзіміра (Уладзімера) Мікалаевіча (2 (15) ліпеня 1901, вёска Агароднікі Вілейскага павета Віленскай губерні – 20 сакавіка 1976, Масква) – паэта, празаіка, перакладчыка. Раздзел пабудаваны па намінальна-храналагічным прынцыпе. Першыя тры справы змяшчаюць экземпляры твораў У.М. Дубоўкі, адабраныя ў яго пры арышце 16 лютага 1949 г., – гэта паэма “Там, дзе кіпарысы” і зборнікі вершаў “Трысьцё” і “Наля”[2]. У экземпляры паэмы “Там, дзе кіпарысы” рукой аўтара папраўлены абдрукоўкі, на тытульным лісце зборніка “Наля” – аўтограф У.М. Дубоўкі. У справах 4–8 прадстаўлены дакументы Міністэрства дзяржаўнай бяспекі (МДБ) і Міністэрства ўнутраных спраў (МУС) СССР (1940-я гг.) і МДБ Грузіі (1998), звязаныя з рэпрэсіямі ў дачыненні У.М. Дубоўкі і яго рэабілітацыяй. У справу 4 вылучана даведка ад 28 ліпеня 1947 г. аб вызваленні У.М. Дубоўкі з папраўча-працоўнага лагеру МУС, адабраная ў яго пры арышце 16 лютага 1949 г. Справы 5–7 змяшчаюць дакументы МДБ Грузінскай ССР, звязаныя з пераследам У.М. Дубоўкі ў гэтай рэспубліцы ў 1949 г. і перададзеныя МДБ Грузіі беларускаму КДБ у 1998 г. у копіях. Асноўная маса афіцыйных папер у дачыненні У.М. Дубоўкі, як відаць з іх копій, паходзіць з 2 спраў ведамаснага архіва МДБ Грузіі. Тытульны ліст адной з гэтых спраў мае загаловак “МГБ ГССР.

[1] Гл.: БДАМЛМ. Ф. 418. Воп. 1. Спр. 19: 1.

[2] Гл. пратакол вобыску У.М. Дубоўкі: БДАМЛМ. Ф. 418. Воп. 1. Спр. 5: 7.

Наблюдательное дело № 1276 на Дубовко Владимир<а> Николаевич<а>”; дакументы гэтай справы датаваны перыядам 4 лютага – 7 мая 1949 г., большая іх частка аформлена пасля арышту У.М. Дубоўкі. Назва другой архіўнай справы МДБ невядома (копіі тытульніка няма); дакументы справы датуюцца перыядам 25 студзеня – 29 красавіка 1949 г., істотная іх частка аформлена напярэдадні або ў працэсе арышту У.М. Дубоўкі. Пастанова следчага аб прад'яўленні арыштаванаму абвінавачання ўваходзіць у абедзве гэтыя справы (у копіях). У вопісе фонду рэпрэсаваных пісьменнікаў БДАМЛМ ксеракопіі названых спраў архіва МДБ Грузіі складаюць справы 5 і 6; справы размешчаны па храналогіі іх пачатковых дакументаў. У справу 7 аб'яднаны копіі яшчэ двух асобных дакументаў у дачыненні У.М. Дубоўкі з архіва грузінскага МДБ. Справа 8 – даведка аб рэабілітацыі У.М. Дубоўкі, справа 9 змяшчае фатаграфіі Дубоўкі, адабраныя ў яго пры арышце або зробленыя падчас арышту аператыўнікамі.

У другі раздзел увайшлі дакументы Багуна Міхася (Блошкіна Міхаіла Фёдаравіча) (8 лістапада 1908, Мінск – 17 лютага 1938 [?], Марыінск Новасібірскай вобласці, ГУЛАГ) – паэта, перакладчыка; Дарожнага Сяргея (Серады Сяргея Міхайлавіча) (25 лютага 1909, Слонім Гродзенскай губерні – 19 ліпеня 1943, Камсамольск-на-Амуры Хабараўскага краю, ГУЛАГ) – паэта, перакладчыка; Мікуліча Барыса Міхайлавіча (6 (19) жніўня 1912, Бабруйск Мінскай губерні – 17 чэрвеня 1954, сяло Машукоўка Удэрэйскага раёна Краснаярскага краю) – празаіка, крытыка; Пальчэўскага Алеся (Аляксандра Восіпавіча) (3 (16) студзеня 1905, вёска Прусінава Мінскага павета Мінскай губерні – 26 красавіка 1979, Мінск) – празаіка; Ракіты Сяргея (Законьнікава Сяргея Васілевіча) (15 кастрычніка 1909, вёска Ліцвінава Горацкага павета Магілёўскай губерні – 23 сакавіка 1942, пасёлак Сухабязводнае Сямёнаўскага раёна Горкаўскай вобласці, ГУЛАГ) – паэта; Хадыкі Уладзіміра (Уладзімера) Марцінавіча (21 снежня 1904 (3 студзеня 1905), вёска Цітва Ігуменскага павета Мінскай губерні – 12 мая 1940, каля Улан-Удэ, Бурат-Мангольская АССР [?], ГУЛАГ) – паэта, перакладчыка; Якшэвіча Аляксандра Іванавіча (Якшэвічуса Аляксандраса Янавіча; *літ.* Jakševičius Aleksandras) (2 студзеня 1886, Шаўлі Ковенскай губерні – 6 красавіка 1971, Вільнюс) – дзеяча камуністычнай партыі, педагога, перакладчыка, цэнзара Галоўліта. Раздзел сістэматызаваны па алфавіце прозвішчаў, дакументы кожнай персаналіі складаюць 1–2 справы. У межах спраў матэрыялы размешчаны, за асобнымі выключэннямі, па храналогіі. Пераважная бальшыня матэрыялаў другога раздзела ўяўляе сабой асабістыя, службовыя і інш. дакументы (пасведчанні, сяброўскія білеты, даведкі і да т. п.), канфіскаваныя ў літаратараў пры арышце. Выключэнне складае справа 13 – машынапісная копія І часткі літаратурнага дзённіка Б.М. Мікуліча "Аповесць для сябе" ("Повесть для себя"): гэта копія была зроблена пасля смерці аўтара. Згодна са сведчаннем С.І. Грахоўскага, аўтарскі рукапіс "Аповесці для сябе" быў канфіскаваны ў Б.М. Мікуліча пры яго арышце 28 красавіка 1949 г., але ў 1970 г. супрацоўнікі КДБ па хадайніцтву М. Танка вярнулі дзённік Мікуліча яго сястры Марыі Міхайлаўне. Тады ж

пачалася падрыхтоўка публікацыі “Аповесці для сябе” ў часопісе “Неман”, з аўтарскага арыгіналу былі зроблены 4 машынапісныя копіі першай часткі дзённіка, напісанай па-руску. Падрыхтоўку публікацыі спыніў КДБ, работнікі якога канфіскавалі з сейфа рэдакцыі “Немана” арыгінал і 3 экземпляры машынапіснага передруку І часткі. Апошні экземпляр машынапісу захаваўся ў М.М. Мікуліч, па ім частка І “Повести для себя” апублікавана ў “Немане” пазней, у 1987 г. (№ 3)[3]. Машынапісная копія, перададзеная КДБ у БДАМЛМ у 1998 г., безумоўна, з’яўляецца адной з трох копій, узятых з рэдакцыі “Немана” ў 1970 г. Пра гэта сведчыць аўтограф А.Я. Макаёнка (рэдактар “Немана” ў 1966–1977 гг., які прыняў “Повесть для себя” да друку) на Л. 22, наяўнасць рэдактарскіх і карэктарскіх памет на большасці лістоў машынапісу. Да передруку дзённіка прыкладзены “Сноски и примечания к “Повести для себя” Б. Микулича” на двух лістах (Лл. 96–97), якія сталі асновай рэальнага каментару да часткі І твора пры яе публікацыі ў № 3 “Немана” 1987 г. Фрагменты дзённіка Б.М. Мікуліча, вызначаныя ў машынапісе на выдаленне з тэксту, у публікацыі 1987 г. (як і ў асобным выданні 1993 г.) адсутнічаюць або падрэдагаваныя[4]. Машынапіс часткі І “Повести для себя” з’яўляецца каштоўнай крыніцай для даследчыкаў творчасці Б.М. Мікуліча, бо поўны і карэктны тэкст літаратурнага дзённіка пісьменніка да сёння не апублікаваны[5].

Прадмову склаў
вядучы архівіст А.У. Адліванчык
17.08.2023

---

[3] Гл.: *Грахоўскі С.І.* Як быў вызвалены дзённік Барыса Мікуліча [пасляслоўе] // *Мікуліч Б.* Аповесць для сябе. Мн.: Маст. літ., 1993. С. 235–237. Рукапіс “Аповесці для сябе” зноў быў вернуты КДБ сястры Б.М. Мікуліча ў 1987 ці 1988 г., па ім у № 12 “Немана” 1988 г. апублікавана заканчэнне дзённіка. Зараз рукапіс захоўваецца ў фондзе Б.М. Мікуліча ў БДАМЛМ: Ф. 334. Воп. 1. Спр. 2.

[4] Відавочна, зноскі-заўвагі і рэдакцыйныя купюры меліся і ў экземпляры машынапісу, які ў 1970 г. пазбег арышту і па якім пачатак дзённіка друкаваўся ў 1987 г. у адсутнасць рукапісу. Зазначым, што ў публікацыі дзённіка ў № 3 “Немана” 1987 г. зроблены дадатковыя тэкставыя купюры, якія не намечаны ў машынапісе 1970 г., атрыманым БДАМЛМ. У асобным выданні 1993 г. тэкст часткі І “Повести для себя” прыведзены па публікацыі “Немана”.

[5] Асобнае выданне “Аповесці для сябе” падаецца публікатарамі як “поўная, без купюр <…> дакументальная аповесць <…> Барыса Мікуліча” – *Мікуліч Б.* Аповесць для сябе. С. 239. Супастаўленне тэксту машынапісу і выдання 1993 г. паказвае беспадстаўнасць такога сцвярджэння.

ПРАТАКОЛ ЭМК №__________

ад "_____"____________20____ г.

ЗАЦВЯРДЖАЮ:

Дырэктар БДАМЛМ

_____________

"_____"____________20____ г.

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1 ДАКУМЕНТЫ У.М. ДУБОЎКІ** | | | | |
| 1 | "Там, дзе кіпарысы". Паэма.<br>Друкаванае выданне.<br>На Лл. 5, 6 адв., 7, 9 адв. - аўтарская праўка абдруковак | 1925 | 19 | 1 | |
| 2 | "Трысьцё. Вершы". Зборнік.<br>Друкаванае выданне | 1925 | 33 | 1 | |
| 3 | "Наля. Вершы". Зборнік.<br>Друкаванае выданне.<br>На Л. 2 - дароўны надпіс У.М. Дубоўкі Н. Замараевай | 1927 | 37 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 4 | Даведка аб вызваленні У.М. Дубоўкі з папраўча-працоўнага лагеру "АФ" МУС СССР.<br>На Л. 1 - пячатка "Министерство Внутренних Дел Союза ССР Управление Исправительно-трудового лагеря "АФ"; на Л. 1 адв. - пячатка "Зугдидский Районный Военкомат СССР" | 1947 | 1 | 1 | |
| 5 | Дакументы з архіва Міністэрства дзяржаўнай бяспекі Грузіі аб арышце У.М. Дубоўкі, прад'яўленні яму абвінавачання, правядзенні ў яго вобыску і інш. На рускай мове, часткова з перакладам на грузінскую.<br>Ксеракопіі з арыгіналаў і копій | 1949 | 11 | 15 | |
| 6 | "Наблюдательное дело № 1276 на Дубовко Владимир<а> Николаевич<а>" Міністэрства дзяржаўнай бяспекі Грузінскай ССР: пастанова аб арышце У.М. Дубоўкі, картка яго дактыласкапіравання, выпіска з пратаколу Спецыяльнай нарады аб яго асуджэнні да ссылкі і інш. дакументы. На рускай мове, часткова з перакладам на грузінскую.<br>Ксеракопіі з арыгіналаў і копій | 1949 | 9 | 8 | |
| 7 | "Обвинительное заключение по следственному делу № 1276 по обвинению Дубовко Владимира Николаевича".<br>Машынапісная копія з копіі.<br>Канфедэнцыяльнае паведамленне з Аддзелу "А" | 1949 | 3 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Міністэрства дзяржаўнай бяспекі Грузіі намесніку пракурора Грузіі аб асуджэнні У.М. Дубоўкі да ссылкі ў Краснаярскі край.<br>Ксеракопія з машынапіснай копіі.<br>На Лл. 1, 2 - пячаткі "Министерство государственной безопасности Грузии <тэкст дубліруецца па-грузінску>" | | | | |
| 8 | Даведка Міністэрства дзяржаўнай бяспекі Грузіі аб рэабілітацыі У.М. Дубоўкі. На рускай мове (тэкст на бланку дубліруецца па-грузінску).<br>Пячатка "Министерство государственной безопасности Грузии <тэкст дубліруецца па-грузінску>" | 1998 | 1 | 1 | |
| 9 | Фатаграфіі У.М. Дубоўкі індывідуальныя.<br>На Л. 1 адв. - тлумачальны надпіс У.М. Дубоўкі і запіс рукой невядомага; на Л. 3 - запіс рукой супрацоўніка Міністэрства дзяржаўнай бяспекі (?) | 1947-[1949] | 3 | 4 | |
| | **2 ДАКУМЕНТЫ М. БАГУНА, С. ДАРОЖНАГА, Б.М. МІКУЛІЧА, А.В. ПАЛЬЧЭЎСКАГА, С. РАКІТЫ, У.М. ХАДЫКІ, А.І. ЯКШЭВІЧА** | | | | |
| | М. Багун (М.Ф. Блошкін) | | | | |
| 10 | Дакументы службовай дзейнасці: пасведчанне супрацоўніка выязной рэдакцыі газеты "Савецкая Беларусь", камандзіровачнае пасведчанне.<br>Машынапіс на бланках.<br>На Л. 1 - 2 пячаткі "Рэд. Газ. "Савецкая Беларусь" Орган ЦВК Саветаў БССР"; на Л. 2 - пячатка "Саюз Савецкіх Пісьменьнікаў Беларускай ССР. ССП БССР" | 1932, 1936 | 2 | 2 | |
| | С. Дарожны (С.М. Серада) | | | | |
| 11 | Асабістыя дакументы, дакументы службовай дзейнасці: пасведчанне стыль-рэдактара часопіса "Работніца і калгасніца Беларусі", службовы пропуск, камандзіровачнае пасведчанне, чытацкі білет.<br>Друкаваныя бланкі з рукапіснымі ўстаўкамі і машынапісам.<br>На Л. 1 - пячатка "Кіраўніцтва спраў Ленінскі камуністычны саюз моладзі Беларусі"; на Л. 3 - пячатка "Беларуская Дзяржаўная Бібліятэка"; на Лл. 5-7, 7 адв. - пячаткі "Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР Звязда" | 1934-1936 | 7 | 4 | |
| 12 | Дакументы бытавога характару: медыцынская | 1934-1936 | 5 | 3 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | картка, пропуск у пагранічную зону (да сваякоў), касавы прыходны ордэр.<br>Друкаваныя бланкі з рукапіснымі ўстаўкамі.<br>На Л. 3 - 2 пячаткі "Управление Пограничной и Внутренней Охраны НКВД БССР. Бюро пропусков в пограничную полосу"; на Л. 3 адв. - пячатка "Ляскавіцкі Сельскі Савет. Пятрыкоўскага раёна" | | | | |
| | Б.М. Мікуліч | | | | |
| 13 | "Повесть для себя. Часть I". Літаратурны дзённік з нататкамі-ўспамінамі.<br>Машынапіс з рэдактарскай праўкай і заўвагамі.<br>На Л. 22 - аўтограф А.Я. Макаёнка; Лл. 96-97 - зноскі-заўвагі неўстаноўленага каментатара | [1970] | 98 | 1 | |
| 14 | Асабістыя дакументы, дакументы бытавога характару: прафсаюзны білет, медыцынскія даведкі, заява ў ваенкамат.<br>Аўтографы, друкаваны бланк з рукапіснымі ўстаўкамі.<br>На Лл. 1, 2 - пячаткі "Профессиональн. Союз работн. Полит.-Просвет. Учреждений. МК Бобруйской Городской Библиотеки" | 1947-1949 | 6 | 4 | |
| | А.В. Пальчэўскі | | | | |
| 15 | Пасведчанне сакратара рэдакцыі часопіса "Іскры Ільіча".<br>Друкаваны бланк з рукапіснымі ўстаўкамі.<br>На Лл. 1 адв.-3, 3 адв. - пячаткі "Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва" | 1936 | 3 | 1 | |
| | С. Ракіта (С.В. Законьнікаў) | | | | |
| 16 | Прафсаюзны білет.<br>Друкаваны бланк з рукапіснымі ўстаўкамі.<br>На Лл. 2-3, 2 адв. - пячаткі "Прафэсыянальны Саюз Работнікаў Выдавецтв СССР. Упаўнаважаны ЦК Саюза па БССР" | 1936 | 5 | 1 | |
| | У.М. Хадыка | | | | |
| 17 | Асабістыя дакументы: сяброўскія білеты літаб'яднання "Маладняк", Саюза савецкіх пісьменнікаў, Літфонду, прафсаюзны білет.<br>Друкаваныя бланкі з рукапіснымі ўстаўкамі.<br>На Л. 2 - пячатка "Усебеларускае Аб'яднаньне паэтаў і пісьменьнікаў "Маладняк"; на Лл. 3, 6 - пячаткі "Прафэсыйн. Саюз Папярова-Паліграф. Прамысл. БССР. Мястком Пісьменьнікаў г. Менску"; | 1927-1936 | 16 | 4 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | на Л. 4 - пячатка <нрзб>; на Л. 11 - пячатка "Саюз Савецкіх Пісьменьнікаў Беларускай ССР. ССП БССР"; на Л. 13 - пячатка "Правление Союза Советских Писателей. Москва"; на Л. 15 - пячаткі "Союз Советских Писателей С.С.С.Р. Литературный фонд Союза ССР", "Саюз Савецкіх Пісьменнікаў БССР. Беларускае Аддзялен. Літфонда СССР" | | | | |
| | А.І. Якшэвіч (Якшэвічус) | | | | |
| 18 | Асабістыя дакументы, дакументы службовай і творчай дзейнасці: сяброўская кніжка касы ўзаемадапамогі, прафсаюзны білет, характарыстыка, умова з Беларускім дзяржаўным выдавецтвам.<br>Пісьмо з Беларускай канторы "Крэдыт-Бюро" да Э. Якшэвіч (жонкі [?] А.І. Якшэвіча) па пытанні яе маёмасці ў Польшчы.<br>Друкаваныя бланкі з рукапіснымі ўстаўкамі, рукапіс, машынапіс.<br>На Лл. 8, 10 - пячаткі "Профсаюз Работнікаў Пачатковых і Сярэдніх Школ БССР. Цэнтральны Камітэт"; на Л. 12 адв. - пячатка "ЦК Саюза Работнікаў Пачатковай і Сярэдняй Школы БССР. Барысаўскі Раённы Камітэт Саюза" | 1933-1936 | 13 | 5 | |
| | *** | | | | |
| 19 | Пісьмо дырэктара БДАМЛіМ Г. Сурмач, віцэ-прэзідэнта АН Беларусі Р. Гарэцкага, старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі В. Зуёнка, старшыні Саюза кампазітараў Беларусі І. Лучанка да старшыні КДБ РБ Э.І. Шыркоўскага па пытанні перадачы з архіваў КДБ у БДАМЛіМ дакументаў рэпрэсаваных дзеячаў беларускай культуры.<br>Машынапісная копія | 1993 | 1 | 1 | |

У дадзены вопіс унесена 19 (дзевятнаццаць)

спраў з № 1 па № 19 , 60 дакументаў.

Вопіс склаў і апрацоўку
фонда зрабіў

вяд. архівіст ______________________ А.У. Адліванчык

Дакументы прынялі:

______________________

______________________

"_____"____________20____ г.